

МАДЭЛЬ З ПРАМЫСЛОВЫМ АКЦЭНТАМ



«МНЕ ЁСЦЬ З ЧЫМ ПАРАЎНОЎВАЦЬ...»



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 верасня 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 177 (29291)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА


## ЛІЧБА ДНЯ

**84,9 %**

*жыхароў краіны — беларусы. За мінулыя дваццаць гадоў працэнт беларусаў у нацыянальным складзе насельніцтва краіны вырас з 81,2 % да 84,9 %. Такая інфармацыя змяшчаецца ў бюлетэні, падрыхтаваным паводле вынікаў перапісу насельніцтва 2019 года і апублікаваным на сайце Белстата. Прычым дадзеныя ў ім прадстаўлены ў дынаміцы. У 1999 годзе пры агульнай колькасці 10 045 237 чалавек беларусаў было 81,2 %, рускіх — 11,4 %, палякаў — 3,9 %, украінцаў — 2,4 %. У 2009 годзе, калі агульная колькасць насельніцтва складала 9 503 807 чалавек, тых, хто лічыць сябе беларусамі, было ўжо 83,7 %, рускіх — 8,3 %, палякаў — 3,1 %, украінцаў — 1,7 %. А яшчэ праз дзесяць гадоў пры колькасці насельніцтва 9 413 446 чалавек беларусамі сябе назвалі 84,9 %, рускімі — 7,5 %, палякамі — 3,1 %, украінцамі — 1,7 %. Што датычыцца іншых нацыянальнасцяў, то іх прадстаўнікоў за мінулыя два дзесяцігоддзі стала менш. Павялічылася колькасць толькі кітайцаў, туркменаў і таджыкаў.*

# У падарожжа на пароме



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Па возеры Івесь, што ў Глыбоцкім раёне, курсіруе эксклюзіўны, гэта значыць, адзіны ў сваім родзе і ў гэткім выглядзе паром. Некалькі гадоў таму «Сварожыч» быў спушчаны на ваду, займеў «прыпіску» на аграсядзібе «Запаведны востраў» і стаў выпраўляцца ў краязнаўча-экалагічныя экскурсіі.**

## КОРАТКА

- Праект новай дзяржпраграмы «Беларускі лес» накіруюць на ўзгадненне ў найбліжэйшы час.
- **Грэчка ў Беларусі ўбрана больш чым з 40 % плошчаў.**
- Шэсць паэтаў і пісьменнікаў Гомельскай вобласці сталі лаўрэатамі літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага.

Год малой радзімы

## ЯК НАДАЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ МАЛЕНЬКАЙ ВЁСАЧЦЫ?

**Выхадзец з Перасудавічаў пачаў з адкрыцця сельскай крамы і замахнуўся на невялікі турыстычны цэнтр**

**Перасудавічы — вёска асаблівая. Хаты зусім неналеплены адна каля адной, як нярэдка бывае. Тут людзі сяліліся з размахам. Кожная сядзіба стаіць наводдаль адна ад другой. Таму і ў сярэдзіне вёскі не пакідае адчуванне прасторы. Разам з цішынёй, спакоем і стракатымі астрамі ў дварах яна стварае карціну нейкай восеньскай урачыстасці. Асаблівa тут, у цэнтры, дзе ўзведзена новая крама з навакольнай інфраструктурай і сучасным добраўпарадкаваннем.**

СТАР. 15



Дзмітрый ЖУКОВІЧ.

Надвор'е

## Уначы ўжо холадна

**Аднак удзень у выхадныя будзе да плюс 24—26 градусаў**

**Да нас ідзе залатая восень. Зусім хутка пачнецца сезоннае пахаладанне, потым хлюпота, першыя начныя замаразкі, але пакуль даволі камфортна.**

Сёння ўдзень пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску ападкаў не чакаецца. Максімальная тэмпература паветра складзе 15—20 градусаў. Сапраўднае восеньскае надвор'е прыйдзе да нас у суботу. У начныя і ранішнія гадзіны чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 да 10 градусаў цяпла, але месцамі паветра астудзіцца да плюс 2—4 градусаў. Удзень тэрмометры пакажуць ад плюс 16 па паўночным усходзе да 24 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

У нядзелю ўначы надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, раніцай і ўдзень — малаактыўны атмасферны фронт. Таму ўначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі, у асноўным па паўночнай частцы краіны, пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да 13 градусаў цяпла. Удзень будзе значна цяплей — 17—24 градусы, па поўдні — да 26 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак наша тэрыторыя апынецца на паўночна-ўсходняй перыферыі антыцыклону з цэнтрам над Польшчай. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 14 градусаў. Удзень будзе 16—23 цяпла, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 26 градусаў. Чакаецца, што да сярэдзіны месяца ў краіне будзе пераважна суха.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «Мы значна прасунуліся ў вырашэнні тых праблем і задач, якія назапасіліся паміж Беларуссю і Расіяй»

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі Дзмітрыем Мезенцавым, паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны.**

«Мы ўсе — і пасольства Расіі, і наша краіна — жывём у канкрэтных умовах. Вы добра бачыце сітуацыю ў Беларусі. Думаю, што ***мы значна прасунуліся літаральна ў апошнія дні, можа быць, пару тыдняў, у вырашэнні тых праблем і задач, якія назапасіліся паміж Беларуссю і Расіяй.*** Хацелася б, каб гэтая дынаміка была захавана», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Падчас нядаўніх перамоваў двух урадавых дэлегацый у Мінску былі дасягнуты вельмі станоўчыя дамоўленасці. «Мы працуем над іх развіццём. Вядома, ***у бліжэйшы час мы сустрэнемся з Прэзідэнтам Расіі і, напэўна, паставім тлустую кропку ў рэалізацыі гэтых адносін і дамоўленасцяў, каб рухацца далей.*** Вядома, яшчэ будзе шмат пытанняў, яны заўсёды будуць. Калі ідзе супрацоўніцтва, з'яўляецца нямала пытанняў, іх, вядома, трэба вырашаць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі будзе эканамічным трамплінам для збліжэння пазіцый па шэрагу пытанняў. «Я лічу, што гэта будзе вельмі моцны крок у рэалізацыі канкрэтных дамоўленасцяў на ўзроўні прадпрыемстваў, — падкрэсліў ён. — Таму развіццё адносін у цяперашні момант нас задавальняе. Думаю, нам не трэба губляць тую дынаміку, якую мы вызначылі».

Прэзідэнт таксама выказаў падзяку паслу за арганізацыю работы расійскіх СМІ ў Беларусі. Дзмітрый Мезенцаў расказаў, што некалькі дзён таму размаўляў са старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Мацвіенка. І яна надае асаблівае значэнне рэгіянальнаму супрацоўніцтву паміж Беларуссю і Расіяй. «Рыхтуецца вялікая дэлегацыя губернатараў, кіраўнікоў суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Мінск падхоплівае эстафету Пецярбурга, калі на пляцоўцы VI Форуму рэгіёнаў было падпісана пагадненняў — дзеля людзей, прадпрыемстваў, бізнес-аб'яднанняў, аграгарадкоў — на $500 мільёнаў. Гэта ж не абстрактныя лічбы, а дадатковы аб'ём у тавараабароце, пашырэнне расійскіх рынкаў для беларускіх пастаўшчыкоў ва ўсіх рэгіёнах», — звярнуў увагу дыпламат.

Дзмітрый Мезенцаў таксама павіншаваў кіраўніка дзяржавы з мінулым днём нараджэння і падарыў яму кнігу з тапаграфічнымі картамі Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, першы экзэмпляр факсімільнага выдання 1866 года.

З першых вуснаў

# «Краіна павінна вярнуцца ўжо ў гэтым годзе да таго бяспечнага перыяду, які быў зусім нядаўна»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прадставіў Андрэя Шведа на пасадзе Генеральнага пракурора.**

Прэзідэнт падкрэсліў вялікі прафесійны вопыт новага кіраўніка, у прыватнасці, працу ў пракуратуры, дзе ён прайшоў шлях ад памочніка пракурора да намесніка Генеральнага пракурора. Акрамя таго, ён працаваў у Дзяржаўным сакратарыяце Савета бяспекі, удзельнічаў у стварэнні Следчага камітэта, пад яго кіраўніцтвам створаны і паспяхова функцыянуе Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. «Гэта адмысловая старонка ў яго жыцці. Яму было даручана стварыць самае сучаснае, фактычна новае падраздзяленне, вельмі важнае для нашай краіны. Яго жыццёвы шлях, вопыт, які ён атрымаў у працэсе сваёй працы, — гэта прыклад падрыхтоўкі тых кадраў, якія павінны кіраваць краінай», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Ён нагадаў пра поспехі былога генпракурора Аляксандра Канюка. «На пасадзе старшыні КДБ ці Генеральнага пракурора, міністра ўнутраных спраў праслужыць больш за 5 гадоў у нашай краіне — гэта няпроста. Калі прыходзіцца круціцца і налева, і направа, абы толькі захаваць незалежнасць і суверэнітэт дзяржавы. Ён праслужыў 9 гадоў на гэтай пасадзе», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка, карыстаючыся выпадкам, выказаў сваё бачанне па тэме работы органаў пракуратуры. «Сёння, скажам так, у Мінску няпросты перыяд. Востры перыяд, які мы перажываем. Напэўна, упершыню ў гісторыі нашай дзяржавы. Прынамсі, апошніх 10 гадоў. Хоць многія са мной не згодныя, успамінаючы сярэдзіну 90-х. Кажуць: ці тое яшчэ было. Многія памятаюць, калі пераварочвалі аўтамабілі, спальвалі іх на дарогах, калі сапраўды дзясяткі тысяч выходзілі на вуліцы. Тады было зразумела: есці не было чаго і дзяцей карміць не было чым», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў, нягледзячы на ўскладненне сітуацыі з выкананнем заканадаўства ў краіне, быць сумленнымі. «Можа, я памыляюся, я асабіста не бачу той актыўнасці пракуратуры, якая адпавядала б цяперашняму перыяду. Актыўнасць павінна быць накіравана, я гэта заўсёды патрабаваў і буду патрабаваць, на захаванне краіны, незалежнасці і яе бяспекі. Краіна павінна вярнуцца ўжо ў гэтым годзе да таго бяспечнага перыяду, які быў зусім нядаўна і які характэрны для нашай краіны. Гэта проста імідж Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мэта каардынацыйнага савета адна — асяддаць пратэсны і апазіцыйны, рухі і стаць над усімі. Гэта значыць, ідзе дзяльба ўлады. Ёсць спроба захапіць уладу, але шляхі розныя. На сённяшні дзень такая сітуацыя», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што, нягледзячы на знешні ўплыў, і ўнутры краіны ёсць дастаткова арганізатараў і прадвадыроў адпаведнай палітыкі. «Як бы ні кіравалі намі з-за мяжы, унутры нашай краіны дастаткова актыўных арганізатараў і правадыроў палітыкі гэтых Telegram-каналаў. Яны — дзясятнікі, сотнікі, тысячнікі — цытую: арганізоўваюць гэтыя пратэсты, арганізоўваюць загадзя. Многія, як ячэйкі на прадпрыемствах па 3-5 чалавек, а дзесьці — па 10 на буйных прадпрыемствах, былі створаны да прэзідэнцкіх выбараў. Пасля парламенцкіх выбараў яны да гэтага рыхтаваліся», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што работнікі органаў пракуратуры павінны стаяць на варце закона, гарантуючы бяспечнае развіццё дзяржавы. «І ўсякія там каардынацыйныя саветы, іншыя арганізацыі... І Канстытуцыйны суд, і Генеральны пракурор у свой час (думаю, і ваш пункт гледжання такі) далі ацэнку гэтым каардынацыйным саветам. Вы павінны даваць не толькі прававую ацэнку дзеянням арганізатараў і агітатараў, але і прадпрымаць больш значныя, вострыя меры пракурорскага рэагавання на падобныя дзеянні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён выказаў меркаванне, што яго часта папракаюць у тым, што ўладу не аддасць. «Правільна папракаюць. Мяне народ не для гэтага выбраў. Як і вы таксама — уладальнікі гэтай улады, яе носьбіты», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт сказаў, што не заклікае выратаваць дзяржаву ў парушэнне закону, але «ажыццяўляецца практычна нахабная інтэрвенцыя звонку і яна падагравацца знутры».

«Яшчэ раз паўтараю: я не заклікаю вас парушаць законы, у нас дастаткова заканадаўства і законаў для таго, каб выратаваць краіну ад гэтага нашэсця, каб яна не паўтарыла варыянты Украіны, Лівіі, Сірыі і гэтак далей, і стабілізаваць абстаноўку ў гэтай краіне. Таму дзейнічайце па законе і памятайце, што вы такія ж грамадзяне, як і Прэзідэнт краіны. І не толькі ў мяне, але і ў вас ёсць дзеці. Гэта вам яшчэ жыць у гэтай краіне і ў новай Беларусі», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт даў загад — да новага года ўнесці прапановы аб павышэнні статусу пракурора. «Выснова адна: пракуратура павінна быць на вастрыі падзей, якія адбываюцца ў краіне. У сувязі з гэтым аб статусе пракурора, мы пра гэта з Андрэем Іванавічам (Шведам) казалі пры прызначэнні. Гэты статус будзе залежаць ад вас. Таму я сказаў, каб да новага года былі ўнесены адпаведныя прапановы аб павышэнні статусу пракурора. Па вертыкалі», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаўся наконт наступстваў пагромаў на вуліцах Мінска, дадае БелТА. «Пасля ўсіх гэтых пагромаў на вуліцы Мінска, якія нам абыходзяцца ў добрыя грошы, вы ведаеце, што застаецца. І цішыня. Ніхто да гэтага часу пра гэта не падумаў, і ніхто не заплаціць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, плаціць трэба, каб людзі разумелі: калі ты нешта паламаў, аднаві за ўласны кошт.

# ПАМЯЦЬ ПРА КЛАСІКА

**У Мінску ўстаноўлена мемарыяльная дошка Васілю Быкаву. Яе размясцілі на пілоне дома на вуліцы Максіма Танка, 10. Тут працяглы час (з 1978 па 2003 год) жыў і займаўся напісаннем твораў беларускі класік.**

Мемарыяльная дошка выраблена з латуннага ліста, мае памеры 1,83 метра ў даўжыню і паўметра ў шырыню і змяшчае скульптурны партрэт пісьменніка, адліты ў бронзе, а вышэй можна ўбачыць аўтограф Васіля Быкава, «напісаны» паверх урыўка з яго аповесці «Атака». Як адзначыў стваральнік помніка скульптар Ігар Засімовіч, працуючы над стварэннем вобраза Васіля Быкава, ён абапіраўся на фотаздымкі і відэаматэрыялы, а таксама на ўражанні ад сустрэч з сынамі класіка. У выніку народнага пісьменніка можна ўбачыць такім, якім яго запомнілі і памятаюць многія — у тым ліку і з падручнікаў па літаратуры.

— Мастацкая рада збіралася тры разы з нагоды працы над гэтай мемарыяльнай дошкай. На першай радзе мы даведаліся, што праект ухвалілі. Потым мы ўдакладнялі і вызначаліся з месцам, дзе дошка будзе размешчана. Пазней ужо абмяркоўвалі эскіз і праект. Дошка была гатовая ў першай палове мая, але з-за эпідэміялагічнай сітуацыі яе ўстаноўка перанеслася на восень. Папярэдне дошку ўсталявалі, а вось афіцыйнае адкрыццё, магчыма, яшчэ наперадзе, — кажа Ігар Засімовіч.



— Але твор ужо займае сваё месца і людзі наведваюць яго. Калі казаць пра тое, што атрымалася, то мы бачым там машынапісную старонку з яго твора — з прысвячэннем, напісаным рукой самога пісьменніка. Паверх мастацкага тэксту аўтограф Васіля Быкава, які выглядае так, нібы гэты аркуш прапалены.

Навіны пра стварэнне мемарыяльнага знака з'явяліся яшчэ ў 2018 годзе, аднак здзейсніць задуманае атрымалася толькі цяпер. Варта адзначыць, што ініцыятарамі ўвасаблення гэтай задумы выступілі дабрачынны фонд Марыі Магдалены Радзівіл і Асацыяцыя беларусаў у Швейцарыі пры падтрымцы МЗС, Міністэрства культуры і Мінгарвыканкама.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Deutsche Bank абвясціў аб будучай «эры беспарадкаў»

Свет апынуўся на парозе структурных змяненняў, якія прывядуць да пачатку новага глабальнага перыяду — «эры беспарадкаў», лічаць аналітыкі Deutsche Bank. Пра гэта гаворыцца ў штогадовым агглядзе, які падрыхтавалі эксперты на чале са стратэгам Джымам Рэйдам. Пандэмія каранавіруса толькі паскорыла набліжэнне новай эры, лічаць яны. Мяжа эпох прыйшлася на 2020-ты. Тэндэнцыя да глабалізацыі, якая характарызавала апошнія сорак гадоў і прывяла да хуткага росту эканомік і актываў, верагодна, аслабее. На думку аналітыкаў, у новых умовах паўстануць рызыкі для бягучых высокіх ацэнак актываў, павялічыцца запазычанасць урадаў і карпарацый, а ў геапалітычным аспекце абвостраца міжкультурныя



супярэчнасці і, у прыватнасці, пагоршацца адносіны паміж ЗША і Кітаем, які імкнецца да статусу эканамічнай супердзяржавы. Бліжэйшыя дзесяць гадоў могуць стаць вырашальнымі для «постковіднай» Еўропы, дзе ёсць рызыкі пагаршэння супярэчнасцяў паміж асобнымі эканомікамі, нават нягледзячы на тое, што аб'яднанне намаганняў па барацьбе з крызісам умацавала інтэграцыйныя працэсы, гаворыцца ў дакладзе.

## Тайланд адклаў адкрыццё граніц для турыстаў



Краіна не адкрыецца для замежных турыстаў у кастрычніку, як планавалася. Улады адклалі адкрыццё межаў з-за першага з канца мая выпадку заражэння каранавірусам унутры краіны, паведамціў Bloomberg. Краіна мела намер дазволіць замежным турыстам уезд на востраў Пхукет на доўгі час. Візы пры гэтым выдавалі б на тэрмін да дзевяці месяцаў. «Урад гатовы [да адкрыцця межаў], але ў некаторых груп застаюцца апасенні, што гэта прывядзе да росту колькасці заражэнняў», — цытуе Bloomberg віцэ-прэм'ера і міністра аховы здароўя краіны Ануціна Чарнвіракула. Чыноўнік падкрэсліў, што са з'яўлення COVID-19 прайшло дзевяць месяцаў і час «навучыцца змагацца і жыць з пандэміяй». Адкрыццё межаў для турыстаў ужо прывяло да паўторных «выбухаў» захворвання ў некаторых рэгіёнах, напрыклад на карыбскім востраве Аруба, адзначае Bloomberg. Сфера турызму Тайланда вельмі разлічвае на вяртанне замежнікаў, таму што на іх прыпадалі дзве трэці даходаў сектара да пандэміі: іх грошы цяпер патрэбныя, каб справіцца з падзеннем бізнесу і захаваць мільёны працоўных месцаў.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

11 верасня 2020 г. № 34 (570)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ





ЭКАНОМІКА

# МАДЭЛЬ З ПРАМЫСЛОВЫМ АКЦЭНТАМ

## Як Ліда развівае эканоміку і паляпшае якасць жыцця

**Роўна год таму Ліда ўвайшла ў лік 11 гарадоў, дзе прынята праграма паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Яна скіравана на вырашэнне ключавых пытанняў горада, забеспячэнне ўстойлівага росту эканомікі, павышэнне дабрабыту гараджан. «Дарожная карта» ўключае каля 20 напрамкаў. Стаўка робіцца на прамысловы патэнцыял рэгіёна.**



### БАЗА ДЛЯ «ПУНКТАЎ РОСТУ»

Увага да Ліды невыпадковая. Сапраўды, тут задзейнічаны магутны вытворчы патэнцыял. Таму і комплексная праграма паскоранага развіцця ў значнай ступені скіраваная на прамысловасць. Гэта адзін з чатырох напрамкаў, які прадугледжвае павышэнне эфектыўнасці работы рэальнага сектара эканомікі.

У горадзе працуюць прадпрыемствы, якія ў свой час мелі агульнасаюзнае значэнне. Многія з іх не страцілі сваю знакамітую марку і застаюцца запатрабаванымі як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Усяго ў раёне 30 буйных прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працуе 13 тысяч чалавек. Доля раёна ў агульнаабласным аб'ёме прадукцыі складае 11,4 %.

У аддзеле эканомікі Лідскага райвыканкама паведамілі, што за паўгода дынаміка агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці склала 100 працэнтаў. За гэты час прамысловымі прадпрыемствамі выраблена прадукцыі на суму 686 мільёнаў рублёў. Спажыўцу адгружана 98 % агульнай вытворчасці прадукцыі, з іх 9 % складае інавацыйная прадукцыя. Сярэдняя зарплата ў прамысловасці ў чэрвені — 1071 рубель.

### ФАРБА З ЛІДЫ — НА ПАТРЭБЫ КРАІНЫ

У Лідзе паскоранае развіццё звязваюць менавіта з нарошчваннем вытворчага патэнцыялу на аснове інавацыйных тэхналогій. Значных поспехаў у гэтым дабіваюцца на валаўтваральным прадпрыемстве «Лакафарба». Дарэчы, прадпрыемства мае стратэгічнае значэнне для ўсёй Гродзенскай вобласці, бо тут выпрабляецца 76 % лакафарбавай прадукцыі ўсяго рэгіёна. Завод пастаянна ўдасканальвае сваю работу. На ім паведамілі, што тут нядаўна завяршылі мадэрнізацыю вытворчасці фталіевага ангідрыду, што дазволіла павялічыць загрузку магутнасцяў і, адпаведна, аб'ём вытворчасці ў два разы. Разам з тым акцэнт робіцца на стварэнні больш даўгавечных поліўрэтанавых лакафарбавых матэрыялаў. Прадукцыя паступае ў 30 краін свету.

Нядаўна на прадпрыемстве пабывалі прадстаўнікі Міністэрства прамысловасці, каб абмеркаваць пастаўкі лакафарбавай прадукцыі на буйныя прадпрыемствы краіны, такія як «МТЗ», «Гомсельмаш», «МАЗ», «Атлант», «Белкард», «Лідсельмаш» і іншыя. Як падкрэслілі на «Лакафарбе», работа на ўнутраным рынку — у прыярытэце прадпрыемства.



У прыватнасці, намецілася тэндэнцыя да імпартазамяшчэння, калі стварэнне новых відаў вырабаў дазваляе знізіць іх кошт на гандлёвых конкурсах буйных прамысловых прадпрыемстваў.

На прадпрыемстве ўпэўнены, што калектыў і надалей будзе трымаць марку завода. Аб гэтым сведчыць і спакойная абстаноўка на заводзе: людзі працуюць на сваіх месцах, атрымліваюць годную зарплату.

### ВЫХАД З КРЫЗІСУ З НОВЫМ КІРАЎНІКОМ

Яшчэ адным важным прамысловым «кітом» можна назваць холдынг «Лідсельмаш», які некалі меў саюзны статус. Але і зараз аграрыі добра ведаюць гэтую тэхніку — камбайны, сушыльныя комплексы, іншыя віды сельгасмашын. Тут пастаянна асвойваюць новыя віды прадукцыі — у тым ліку плёнкі, кантэйнеры для смецця, тавары народнага спажывання.

Але на прадпрыемстве склалася вялікая запазычанасць па крэдытах, што стварае праблемы з абаротнымі сродкамі. Іх не хапае. У райвыканкаме выхад з крызіснага стану звязваюць з прыходам новага кіраўніка. **Дырэктар Рыгор ІВАНЬКОЎ** заняўся аптымізацыяй неэфектыўнай вытворчасці. Тут перасталі працаваць на склады, сталі іх разгружаць. Узнавілася работа з дылерамі, вызначыліся перспектыўныя напрамкі. Асноўным па-ранейшаму застаецца выпуск сельгастэхнікі, у тым ліку зернесушыльных комплексаў.

Яшчэ адным з кірункаў з'яўляецца выпуск стальных панэльных ацяпляльных радыятараў. На прадпрыемстве шукаюць новыя рынкі збыту, напрацаваны партфель заказаў, які забяспечвае загрузку магутнасцяў да канца года. Іх будзе выпускацца да 1 тысячы ў суткі. Гэта дасць магчымасць павялічыць аб'ём вытворчасці і выйсці на дакрызісны аб'ём — 250 тысяч радыятараў у год.

А зусім нядаўна запушчана вытворчасць спецыялізаваных кантэйнераў для транспарціроўкі рулоннай сталі на чыгунцы. Гэта прадукцыя новая не толькі для Ліды, але і для ўсёй краіны. Падпісаны выгадны валютны заказ на 10 мільёнаў еўра. Зараз кантэйнеры паступаюць у Польшчу, ідзе пошук і іншых партнёраў, у прыватнасці ў Расійскай Федэрацыі і краінах ЕАЭС.

Па словах памочніка генеральнага дырэктара холдынга «Лідсельмаш» Анатоля Жаўнерчыка, на прадпрыемстве ўпэўнены ў сваіх кадрах. Калектыў зладжана працуе, планавыя паказчыкі выконваюцца. Людзі трымаюцца за свае працоўныя месцы, бо разумеюць, што ад іх работы залежыць эканамічны стан прадпрыемства, а значыць, і іх уласны дабрабыт. Адпаведна, гэта становіцца паўплывае на зарплату. Сёлета тут мяркуюць выйсці на прыбытак каля 900 тысяч рублёў.

### НЕ ШПАРКА, АЛЕ З ДЫНАМІКАЙ

Завод «Оптык» — адно з тых прадпрыемстваў, якія стварaліся для паставак абаронкай прамысловасці былога Саюза. Завод у свой час паспяхова прайшоў дыверсіфікацыю і зараз забяспечвае такую важную галіну, як медыцына. Не толькі ў краіне, але і за яе межамі запатрабаваныя лінзы, прызмы, валаконна-аптычныя пласціны і іншыя тавары. У 2022 годзе тут плануюць завяршыць інвестыцыйны праект па рэканструкцыі аптычнай вытворчасці. Гэта дазволіць захаваць існуючыя пазіцыі і павялічыць экспарт да 70 % ад аб'ёму вытворчасці. Увогуле вытворчасць вымяральнай і аптычнай тэхнікі складае 10 % ад усяго аб'ёму вытворчасці раёна.

Разам з тым на складах некаторых прадпрыемстваў захоўваюцца значныя аб'ёмы прадукцыі. Не ўсе працуюць на поўную магутнасць і цалкам выкарыстоўваюць свае вытворчыя плошчы. Да таго ж ёсць праблема кваліфікаваных кадраў. Але найбольш востра стаіць пытанне маральнага і фізічнага зносу абсталявання. Таму прадпрыемствамі вядзецца работа па зніжэнні невытворчых расходаў і пошуку стратэгічнага інвестара, у тым ліку прыватнага. Дарэчы, гэты сектар эканомікі мае ўсе магчымасці для развіцця.

Выкананне Комплекснага плана паскоранага развіцця Лідскага раёна знаходзіцца на пастаянным кантролі ў мясцовых улад, паведамілі ў райвыканкаме. За першае паўгоддзе ёсць станоўчая дынаміка па пяці мэтавых індыкатарах развіцця раёна, у ліку якіх — сярэднямесячная зарплата, рост колькасці занятых у эканоміцы, выручка ад рэалізацыі прадукцыі, інвестыцыі ў асноўны капітал, даходы ў бюджэт. Прамысловым комплексам асвоена больш за палову планавага фінансавання, сродкі ідуць у асноўным на мадэрнізацыю вытворчасці.

Інвестыцыі на распрацоўку новых вырабаў накіраваў шклозавод «Нёман», прадукцыя якога вядомая і папулярная ў многіх краінах свету. Некалькі гадоў таму тут пачалі выпуск мінеральнага ўцяпляльніка на аснове шкловалакна. Летась на шклозаводзе асвоілі 210 відаў новай прадукцыі, у тым ліку з зялёнага крышталю з лазернай гравіроўкай. У той жа час тут працуюць над тым, каб даць новае жыццё «старым» формам.

Новае жыццё атрымліваюць і старыя будынкі. Вялікі корпус былога завода «Ізатрон» доўга стаяў закінуты, хоць уласнікам лічыўся літоўскі інвестар. Паколькі ніякага інтарэсу да пабудовы з яго боку доўгі час не было, яна перайшла да новага ўласніка з Салігорска. Як паведамляе прэс-служба Лідскага райвыканкама, да вясны будучага года інвестар павінен правесці экспертызы, узгадненні і пачаць праектныя работы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

НА СЛЫХУ

## Увага рэгіёнам

**У Беларусі падрыхтуюць прапановы па пашырэнні паўнамоцтваў урада і мясцовых органаў улады.**

У Беларусі створана міжведамасная рабочая група для падрыхтоўкі прапаноў па пашырэнні паўнамоцтваў урада і мясцовых органаў улады. Гэта прадугледжана распараджэннем прэм'ер-міністра ад 4 верасня 2020 года № 176р, паведамляецца на сайце ўрада.

Рабочай групе даручана да 20 верасня правесці комплексны аналіз заканадаўства па пытаннях адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, зацвярджэння генеральных планаў, архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці, найменняў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, устанаўлення мясцовай геральдыкі, узгаднення кадравых прызначэнняў, устанаўлення колькасці і структуры мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Члены групы таксама прааналізуюць заканадаўства па адабранні і выдзяленні зямельных участкаў, рабоце з дзяржаўнай маёмасцю, іншых пытаннях, якія прадугледжваюць уключэнне ў іх рашэнне кіраўніка дзяржавы.

Таксама міжведамаснай рабочай групе неабходна выпрацаваць на аснове праведзенага аналізу сістэмныя прапановы па пашырэнні паўнамоцтваў урада і мясцовых органаў улады.

Кіраўніком групы будзе першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў.

# Віктар ЛІСКОВІЧ: «МНЕ ЁСЦЬ З ЧЫМ

## Першая палова жыцця прыйшлася на савецкі перыяд, 270 гадоў на ўсіх!

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ адсвяткаваў прыгожую ва ўсіх адносінах дату — 60-гадовы юбілей. У эксклюзіўным інтэрв'ю «МС» ён расказаў аб сваёй сямейнай дынастыі, якой, дарэчы, ужо 270 (!) гадоў, жыццёвых універсітэтах і планах на перспектыву. У якасці спойлера: выдавецкую дзейнасць сураздмоўнік спыняць не збіраецца і з выхадам у адстаўку паедзе ў каралеўскі горад. Хочаце больш дакладна? Даведаецеся з сённяшняга інтэрв'ю.**



### «Сацыялка» на цэнтральным месцы

***«МС»: Вы адзін з нямногіх парламентарыяў, які мае дастаткова багаты вопыт заканадаўчай дзейнасці: у свой час працавалі ў профільнай камісіі ў ніжняй палаце, зараз узначальваеце аналагічную камісію ў верхняй палаце — ці адбіваецца папярэдні вопыт на цяперашнім статусе?***

— Я пачну з таго, што кіраўнічы, арганізацыйны вопыт работы, дзе я прайшоў усе этапы выканаўчай улады — працаваў звычайным урачом, загадчыкам аддзялення, галоўным акушэрам-гінеколагам Гродзеншчыны, галоўным урачом буйной медыцынскай установы, намеснікам старшыні аблвыканкама — гэта адзін кірунак маёй дзейнасці. Другі звязаны з грамадскай дзейнасцю. Старшынёй прафсаюзнай арганізацыі Астравецкай цэнтральнай раённай бальніцы, у якой было больш за 600 супрацоўнікаў, я быў 9 гадоў. І гэты час, безумоўна, не мог не адбіцца — я атрымаў каласальны вопыт! Потым я быў дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў, двойчы абласнога Савета, у Палаце прадстаўнікоў пятага склікання працаваў у Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Таму мне добра вядомыя абедзве вертыкалі ўлады — і веданне, менавіта, практыкі выкарыстання законаў і працэсу падрыхтоўкі законапраектаў спрыяе таму, што сёння можна прадметна, канкрэтна, дакладна і хутка прымаць рашэнні па праблемах, якія ўтрымліваюцца ў зваротах грамадзян, па ўнясенні паправак у законапраекты, якія сёння праходзяць праз нашу камісію ў межах яе кампетэнцыі.

***«МС»: Профільная камісія, якую вы ўзначальваеце, як ніякая іншая зразумелая і блізкая людзям — ахова здароўя, адукацыя, культура, працэй кажучы, «сацыялка» — складае цэнтральную частку нашага жыцця. На ваш погляд заканадаўцы, якая са сфер зараз патрабуе ўдасканалення?***

— Пакуль чалавек жыве, ён ніколі не спыняецца на дасягнутым, і спыненне працэсу наогул быць не можа. А сацыяльны кірунак — гэта наша жыццё ад нараджэння да глыбокай старасці, таму тут вельмі важна не ўпусціць ніводнага аспекту. Нарадзіўся чалавек — патрэбна якасная медыцынская дапамога, каб былі здаровыя бацькі, каб дзіця расло здаровае і развівалася, каб яно ў садку атрымала задаткі адданасці сваёй краіне, любові да яе — з трох гадоў ужо можна фарміраваць гэтыя каштоўнасці. Далей яно пайшло ў школу, дзе выбудоўвае свае стасункі з іншымі дзецьмі, вучыцца навучаца перш за ўсё. Далей чалавек становіцца студэнтам ці атрымлівае рабочую спецыяльнасць — таксама вельмі важна, як яго сустрэнуць у калектыве, як ён пройдзе першы этап навучання і выкарыстае тыя веды, якія атрымаў у навучальнай установе. Тут вельмі значную ролю адыгрывае настаўніцтва, замацаванне першага рабочага месца і г. д. Далей чалавек уступае ў актыўную фазу (хтосьці становіцца работнікам вытворчасці, хтосьці — навукоўцам, хтосьці — кіраўніком) і на гэтым этапе важна, як раскрываецца яго талент. Тут свае законапраекты, якія суправаджаюць яго ў жыцці. Потым надыходзіць пенсійны ўзрост, патрэбная сацыяльная абарона — тут таксама ёсць свае нюансы, якія трэба ў адпаведнасці з умовамі нашага жыцця, эканомікай краіны выбудоўваць у адпаведныя законапраекты. І вельмі важна, каб гэтыя дакументы ішлі ад жыцця, ад інтарэсаў, якія датычацца асноўнай масы людзей, а не вузкай яе катэгорыі. Але яшчэ раз падкрэслю, пакуль чалавек жыве — ён заўсёды будзе развівацца, і адпаведна, законы пішуцца людзьмі і для людзей, для камфортнага жыцця грамадства. Таму я не сказаў бы, што сёння нейкі законапраект вельмі важны.

Самае галоўнае на сённяшні дзень — гэта моладзь і яе запатрабаванасць у грамадстве, яе любоў да Радзімы і яе ўнёсак у будучае краіны. Трэба інвеставаць у моладзь сілы, сродкі, каб чалавек любіў сваю краіну. Вядома, бацькоў і краіну не выбіраюць: яны даюцца нам Богам адзін раз, і мы павінны іх усрымаць такімі, якія яны ёсць — самымі лепшымі і любімымі. І пачынаць з маленства.

### Дасягнуць вышынь можа кожны

***«МС»: Не магу не запытацца аб ацэнцы таго, што зараз адбываецца ў краіне: чаго не хапае?***

— Наконт таго, што зараз адбываецца, скажу шчыра, я ніколі не мог уявіць, што змагу стаць сведкам спроб узрушыць нашу краіну. Яшчэ раз пераконваюся, што з моладдзю трэба вельмі плённа працаваць, паказваць ёй, што было ў нашым грамадстве раней і што стала цяпер. Я бачыў розныя этапы развіцця краіны. Быў у мяне 1991 год, калі як старшыні прафсаюзнай арганізацыі мне даводзілася размяркоўваць тавары, талоны, купоны... Было вельмі цяжка: не было ні зарплаты, ні тавараў — нічога не было, але краіна справілася з гэтай разрухай. І сёння створана сучасная моцная сацыяльна накіраваная дзяржава. Які сэнс усё гэта страчваць у адзін момант?! Са свайго боку я ацэньваю сённяшнія з'явы, бо бачыў дрэннае, таму я даражу здабыткамі. Упэўнены, што моладзь трэба вучыць на прыкладах гісторыі, каб было з чым параўнаць і бачыць, што ты ідзеш наперад. Перакананы, калі ты сёння хочаш і можаш працаваць — дасягнеш у сваёй краіне любых вяршынь. Я, напрыклад, пачынаў працоўную дзейнасць яшчэ ў Савецкім Саюзе. Асноўны ж этап жыцця прайшоў у незалежнай Беларусі. Абодва перыяды ўмоўна можна падзяліць напалову (крыху больш за 30 у адным і амаль 30 цяпер), таму хачу сказаць, магчымасць рэалізаваць сябе была заўсёды. У мяне, напрыклад, простыя бацькі. Нарадзіўся я ў Кобрыне, што ў Брэсцкай вобласці, закончыў звычайную школу. Першыя чатыры гады вучыўся ў трэцюю змену — а палове дзявятай вечара заканчваліся заняткі, актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю: быў старшынёй піянерскай дружыны, сакратаром камсамольскай арганізацыі школы. Мне падабалася вучыцца, асабліва цікавілі дакладныя навукі: фізіка, хімія, матэматыка, чарчэнне. У свой час стаў прызёрам абласной алімпіяды па фізіцы. Калі я скончыў у 17 гадоў школу і паступіў у медінстытут, прыйшоў туды абсалютна з дакладным разуменнем, што такое краіна — гэта тое месца, дзе ты патрэбны. Так атрымалася, што ўвесь апошні час — 36 гадоў — я прысвяціў Гродзенскай вобласці, з іх 13 — Астравецкаму раёну. Усе гэтыя этапы сведчаць аб чым? Што звычайны чалавек можа сябе рэалізаваць — для гэтага створаны ўсе ўмовы. У свой час я абараніў кандыдацкую дысертацыю, не будучы аспірантам, без адрыву ад вытворчасці, бо лічыў гэта патрэбным для ўласнага развіцця, краіны і ганаруся тым, што ідэя маёй кандыдацкай дысертацыі «Рознаўзроўневая сістэма перынатальнай дапамогі» была укаранёна ў маштабах краіны і цяпер паспяхова функцыянуе. Я адзін з аўтараў распрацоўкі гэтай сістэмы, укаранёнай на першым этапе ў Гродзенскай вобласці, дзе яна дала вельмі адчувальныя вынікі, пасля чаго пайшло развіццё ва ўсёй краіне. Але я не кажу, што зрабіў гэта адзін. Спачатку цябе суправаджаюць твае настаўнікі, потым ты павінен суправаджаць сваіх вучняў. Тады будзе пераемнасць пакаленняў. У мяне былі найлепшыя настаўнікі, якія зрабілі розны ўнёсак у мае станаўленне, развіццё, фарміраванне як асобы — гэта і медыкі, і кіраўнікі, і арганізатары аховы здароўя. Іх каля 10 чалавек. А цяпер я вельмі задаволены тым, што ў мяне ёсць і мае вучні, якія, не баюся сказаць, разумнейшыя за мяне, больш паспяховыя і вельмі ганаруся, калі нехта звяртаецца да мяне па параду.

> Аўдыторыі юнакоў і дзяўчат падабаецца, калі ты зразумелай мовай расказваеш ім, што было, што будзе, дзелішся сваім бачаннем і меркаваннем. І яны адгукаюцца на такі дыялог.



З дзедам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны — Лаўрэнціем Пятровічам Лісковічам.

***«МС»: Калі мы ўжо закранулі вопыт вашай урачэбнай дзейнасці, яе практычнага выкарыстання, не магу не закрануць сям'ю, якая з'яўляецца прыкладам пераемнасці пакаленняў, урачэбнай дынастыі. Ведаю, што сумарны стаж вашай сям'і складае больш за 250 гадоў...***

— Падлічылі — 270 гадоў.

***«МС»: Ці плануе самае маладошае пакаленне — ваша ўнучка — працягнуць сямейную дынастыю?***

— Ёй 12 гадоў. Яна любіць медыцыну, але ці пойдзе яна ў гэтым кірунку развівацца далей, я не ведаю, гэта будзе яе выбар. Калі мае дзеці прымалі рашэнне, ніякага ціску з нашага боку не было, трэба каб работа прыносіла радасць і задавальненне. Мала жадаць — трэба, каб ты адчуваў сваю прафесію. А наогул, прафесійная дзейнасць пачыналася з брата майго бацькі Аляксея Лісковіча, які памёр, на жаль, у 47-гадовым узросце, меў навуковую ступень, ад яго вельмі хуткімі тэмпамі пайшла ўся наша дынастыя. Потым быў я, мая сястра, яе муж, мая жонка і яе сёстры, мае дзеці, зяць і іншыя сваякі...

***«МС»: А калі паглядзець па спецыялізацыях?***

— Усе розныя: ад урача-дыетолага да галоўнага акушэра-гінеколага вобласці. Але там ёсць кардыёлагі, дэрмата-венеролаг, тэрапеўт, нефролаг, неўролаг, педыятр і акушэры-гінеколагі я і мой зяць. Іншымі словамі, амаль увесь спектр спецыяльнасцяў. Калі вылучаць з усіх, не перабольшваючы ці змяншаючы вагу кожнага, я спынюся б на дзвюх. Першая — гэта жонка, якая з 1991 года працуе загадчыкам аддзялення ў розных бальніцах: Астравецкая ЦРБ, Гродзенская раённая бальніца і абласны кардыяцэнтр. Другая, кагоб я вылучыў, — малодшая дачка, асістэнт кафедры скурна-венералагічных хвароб Гродзенскага медуніверсітэта. Яна паспяхова абараніла дысертацыю, вядзе заняткі для замежных студэнтаў па-англійску, з майго пункту гледжання, гэта падкрэслівае веданне свайго прадмета.

***«МС»: Дзе адбылася закладка вашага базісу як прафесіянала ў галіне аховы здароўя?***

— У медыцыне я прайшоў усе этапы: працаваў у райцэнтры, фактычна сельскай мясцовасці, потым галоўным урачом у абласным цэнтры, галоўным акушэрам-гінеколагам вобласці, іншымі словамі, уся лінейка пасад, за гэты час прыняў 6,5 тысячы родаў. Хачу сказаць, што самы важны этап — гэта работа ў раённым цэнтры. Гэта тое месца, дзе ты вельмі хутка фарміруешся з прафесійнага пункту гледжання, таму што ты павінен імгненна прымаць рашэнні. Калі ты зробіш нешта няправільна, аўтарытэту ў раёне ніколі не заробіш. 13 гадоў астравецкага перыяду з пункту гледжання фарміравання спецыяліста — самыя каштоўныя і важныя.

## Спытайце ў дарослых

**На тэлеканале АНТ з 12 верасня гледачоў чакае прэм'ера — праграма «101 пытанне даросламу». Гэта ток-шоу, дзе дарослы герой будзе адказваць на пытанні дзяцей 9—17 гадоў. А мадэрыруе іх размову вядучы, чый голас мы чуем толькі за кадрам.**

Удзельнікамі першых выпускаў станунць артыст балета і выкладчык Мікалай Цыскарыдзэ, спявачка Дзіяна Арбеніна, рэпер Feduk, мастацкі кіраўнік Тэатра сатыры Аляксандр Шырвінт, артыстка Паліна Гагарына і многія іншыя. Так, у найбліжэйшай прэм'ернай праграме героем будзе ўрач Дзяніс Працэнка, у якога юныя інтэрв'юеры распытаюць пра небяспеку віруса, стаўленне да ўрачэбных памылак, а таксама пра выбар прафесіі і прагулы ў школе, медыцынскі гумар і залежнасць жыццёвага поспеху ад ацэнак у атэстаце.

Як кажа тэлевядучы Сяргей Шубянкоў (яго голас мы чуем у праграме за кадрам), аўдыторыю чакае вяртанне тэлешоу, якое ведалі і любілі доўгія гады, у новым фармаце. «У новым сезоне мы імкнуліся захаваць усё тое, за што аўдыторыя палюбіла гэтую праграму: дзіцячую непасрэднасць, шчырасць і адсутнасць страху задаць нязручнае пытанне чалавеку. І крыху «ажывілі» закадравага вядучага, што мне вельмі прыемна. Таму што цяпер я магу ў гумарыстычным ключы каментаваць размову героя з дзецьмі. Спадзяюся, новае жыццё нашага шоу будзе насычаным і працяглым!»

Што ж, хутка ўбачым, наколькі ўдала пройдзе вяртанне праграмы. Чакаем трансляцыю першага выпуска 12 верасня на тэлеканале АНТ.



## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 122

З 14 да 16 жніўня ў Драгічыне адбыўся традыцыйны 29-ы па ліку турнір па рускіх шашках — «Етвызь-2020». У спаборніцтвах узялі ўдзел 60 шашыстаў, у тым ліку 15 майстроў спорту. Перамог у турніры міжнародны майстар з Мінска Аляксей Куніца — 13 ачкоў з 18 магчымых. Сем удзельнікаў набралі па 12 ачкоў. Лепшы каэфіцыент выверў на другое месца майстра з Гродна Эму Макарэвіч. Бронза дасталася кандыдату ў майстры з Драгічына Мікалаю Піцуху.

**№ 90**



**№ 90** А. Бакумец

**Белыя простыя шашкі:** a3, c3, d4, e3, f2, f4, h2 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b6, c7, f8, g5, h6, h8 (7)

У пазіцыі на дыяграме белыя, выкарыстоўваючы пагрозы, прымушаюць суперніка прайсці ў дамкі, затым перамагаюць.

1. h2-g3! c7-d6 (трэба ратавацца ад пагрозы 2. св4+) 2. g3-h4!! f8-g7 (чорныя вымушаны прымаць «падарунак», бо страчваецца шашка) 3. h4:f6 g7:b4 4. a3:a7 a5-b4 5. a7-b8 b4-a3 6. b8:g3 a3-b2 [ 6...h6-g5 7.e3-f4 g5:c5 8. g3-e5 x ] 7. e3-f4 b2-a1 8. g3-h2 x

Яшчэ некалькі кампазіцый прапануем вырашыць самастойна.

**№ 91** Анатоль Баланюк (Украіна)

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, f2, g3, b4, f4 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, h2, d4, c5, e5, d6, e7 (7)

**№ 92** В. Варушыла

**Белыя простыя шашкі:** f2, d4, b6 белыя дамкі: c1(4)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, f6, a7, g7, d8, чорныя дамкі d6 (6)

**№ 93** В. Кручкоў (Украіна)

**Белыя простыя шашкі:** 46, 38, 39, 28, 30, 24, 19, 14 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 41, 37, 40, 35, 27, 23, 6, 7 (8)

**№ 94** В. Кручкоў

**Белыя простыя шашкі:** 44, 37, 35, 27, 24, 19, 11 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 36, 40, 28, 25, 12, 9, 10 (7)

**№ 95** Ігар Цярэшка (Мінск)

**Белыя простыя шашкі:** 48, 50, 44, 45, 38, 39, 31, 32, 33, 27, 30, 16, 15 (13)

**Чорныя простыя шашкі:** 34, 35, 23, 24, 17, 19, 12, 13, 7, 8, 10, 2, 4 (13)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 121 ад 28.08.2020.

**№ 84** 1. cd4? ed6 2. dg5 de5 3. fd6 hd2 4. ce3 ab8+. Нічыя была магчыма пасля 1. cd2 ac1 2. fe5 ff2 3. cd4 ce3 4. dc1+

**№ 85** 1. 20-14 39:46 2. 14:05 46:14 3. 05:18 12:23 4. 34-29 23:34 5. 50-44 +

**№ 86** 1. 23-18 17:48 2. 18:07 02:11 3. 13:02 24:13 4. 02:18 35:24 5. 18-34 48:30 6. 25:34+

**№ 87** 1. a5-b6 c5:a7 2. e3:c5 d6:d2 3. f4:h6 h2:f4 4. c1:g5 a3:c1 5. f2-e3 c1:f4 [ 5...h4:f6 6. e3-f4 c1:g5 7. h6:e3 f6-e5 8. e3-c5 e5-f4 9. c5-f2 ] 6. g5:e3 h4-g3 7. e3-f4 g3:e5 8. h6-e3+

**№ 88** 1. h6-g7 f8:h6 2. a5-b6 c5:a7 3. e3:c5 d6:b4 4. f4:f8 h2:f4 5. f8:g5 h6:f4 6. e1-d2 c3:g3 7. h4:f2 a7-b6 8. a1-b2 b6-c5 9. b2-c3+

**№ 89** 1. d2-e3 c5:a3 2. e3:c5 d6:b4 3. f4:f8 h2:f4 4. f2-e3 f4:d2 5. e1:a1 b4-c3 6. f8-h6 a3-b2 7. h6-c1 + (аўтар кампазіцыі — В. Варушыла).

З лістоў чытачоў: «Дзякуй вядучаму за выдатна падабраны матэрылял. Рашаць было цікава», — піша Фёдар Карпей з Мядзела.

Першымі дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск). С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н).

*Пішыце па адрасе: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# Кадры жыцця і вялікае мастацтва на «Беларусь 3»

**Восень па традыцыі на тэлебачанні радуе прэм'ерамі. І на сацыякультурным тэлеканале Белтэлерадыёкампаніі нас чакаюць цікавыя падзеі. Тут 13 верасня прадставяць новы праект уласнай вытворчасці «Кадры жыцця», а ў канцы месяца гледачы ўбачаць тэлеверсію балета «Пер Гюнт». Акрамя гэтага, вядома, не абыдзецца без тэматычных праграм, паказу дакументальнага і мастацкага кіно.**

Што датычыцца новага праекта, то «Кадры жыцця» — гэта цыкл інтэрв'ю з вядомымі прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі нашай краіны. Праект прапануе гледачам абноўлены фармат знаёмай праграмы «Майстры і куміры» — у арыгінальнай студыйнай «кіназале» з новымі дэкарацыямі. Праз архіўныя відэаматэрыялы і, бадай, самыя каштоўныя фонды жывых чалавечых успамінаў запрошаных гасцей здымачная група «Беларусь 3» разам з вядучымі праекта Сяргеем Кацьерам і Марынай Драгінай паспрабуе паназіраць за лёсамі творцаў



у сацыякультурным кантэксце гісторыі краіны і знайсці пункты ўзаемнага ўплыву.

— Праз гісторыі нашых герояў у студыі — людзей знакавых і цікавых — мы запісваем своеасаблівую культурную біяграфію нашай краіны, — кажа **кіраўнік і сувядучы праекта «Кадры жыцця» Сяргей КАЦЬЕР.** — Расповеды нашых майстроў унікальныя. І мне, у сваю чаргу, заўсёды цікава, як мой асабісты лёс перасякаецца з лёсамі творчых людзей.

У першым выпуску праграмы, які выйдзе на «Беларусь 3» у наступную нядзелю ў 19.25, гледачоў чакае сустрэча з кінарэжысёрам, сцэнарыстам, паэтэсай Аленай Туравай (аўтар анімацыйных і гульнявых фільмаў, дзе і «Навагоднія прыгоды ў ліпені», «Кіндэрвілейскі прывід» і іншыя). Яна падзеліцца ўспамінамі пра дзяцінства і знакамітых бацькоў, пра першыя крокі на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», а таксама раскажа малавядомыя факты пра свае рэжысёрскія работы. Візуальным суправаджэннем размовы стане паказ архіўных відэаматэрыялаў з фонду Белтэлерадыёкампаніі.

А доўгачаканую прэм'еру спектакля «Пер Гюнт», якім адкрыў свой 88-ы сезон Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатра оперы і балета, прыхільнікі мастацтва ўбачаць 27 верасня ў эфіры «Беларусь 3». Нас чакае харэаграфічная пастаноўка ў 2 дзеях на музыку Грыга і па матывах драмы Ібсена. Гісторыю, напоўненую скандынаўскімі містычнымі матывамі і рамантычнымі пошукамі ідэалу, на мове танца выкажуць майстры сцэны — на чале з дырыжорам-пастаноўшчыкам спектакля, народным артыстам Беларусі Аляксандрам Анісімавым, балетмайстарам-пастаноўшчыкам Сяргеем Мікелем і мастаком-пастаноўшчыкам Любоўю Сідзельнікавай.

Здымачная група канала «Беларусь 3» правяла адзін з прэм'ерных вечароў балета «Пер Гюнт» разам з першымі гледачамі ў Вялікім тэатры, а ў канцы месяца прадставіць свеёй тэлеаўдыторыі кранальную гісторыю здабыцця сапраўднага «я» і бессмяротнай шчырасці кахання ў тэлеверсіі спектакля. Сачыце за праграмай эфіру і знаёмцеся з найлепшымі творамі мастацтва, а таксама з тымі, хто іх ствараe.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Белтэлерадыёкампаніі.**


— Ваеннага перыяду. На працягу ўсяго жыцця яна мне падабалася, цікавасць не страчваецца і зараз. Асабліва прываблівають дакументальныя хронікі. Я знаёмы з такой літаратурай, што выдавалася ў савецкі час, практычна перачытаў усю — гэта мемуары военачальнікаў, кнігі аб партызанскім руху Беларусі. Я захапляюся мемуарамі Жукава, Ракасоўскага, Васілеўскага. Яны ў мяне да гэтага часу захоўваюцца з дзіцячых гадоў (Жукава, напрыклад, я перачытваў чатыры разы і кожны раз успрымаў па-новаму). Вельмі цікавы чалавек з няпростым лёсам, але які настолькі любіў сваю дзяржаву, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці на яго шляху, дэманстраваў прыклад любові да Радзімы. Дзякуючы яму і яго ўнёску ў Вялікую Перамогу мы маем сёння мір.

## Што цікавага ў сацсетках?

***«МС»: Крыху адыдзем ад мінулага да сучаснасці: не так даўно ў вас з'явіўся акаўнт у «Інстаграме». Не магу не спытаць: гэта даніна модзе ці жаданне быць на сувязі з маладзёжнай часткай аўдыторыі?***

— Вельмі шкадую, што не пачаў займацца гэтым раней. Хоць бы два-тры гады таму. Вывучыў я яго хутка і зразумеў, што асноўная аўдыторыя падпісчыкаў — моладзь. Там проста так падпісчыкаў не набярэш, пакуль яны самі не захочуць гэтага зрабіць. Аўдыторыі юнакоў і дзяўчат падабаецца, калі ты зразумелай мовай расказваеш ім, што было, што будзе, дзелішся сваім бачаннем і меркаваннем. І яны адгукаюцца на такі дыялог. Перакананы, адмаўляцца ад новага нельга. Мы часам так робім з адной прычыны: лічым гэта негалоўным і неактуальным. Але калі асноўная частка моладзі ўспрымае гэты канал перадачы інфармацыі, вынік адзін: бяры, вучыся, даганяй і выкарыстоўвай.

***«МС»: Дарэчы, аб маладзёжнай аўдыторыі: вы не так даўно бралі ўдзел у «Адкрытым дыялогу», які арганізавала саюзная моладзь у Гродне, якія адчуванні і высновы ад такой формы зносін?***

— Дыялог атрымаўся дастаткова адкрыты і шматвектарны. Я хачу сказаць, што дыялогі патрэбны ў розных фарматах, у розных кірунках. З якой перыядычнасцю? Адказ адназначны — пастаянна: адзін на адзін, з невялічкай групай, вялікай аўдыторыяй, але дыялог павінен быць няспынны. Нават калі ты размаўляеш з маладым чалавекам па вырашэнні простага пытання — гэта ўжо мае карысць. Ён чуе, разумее, пагаджаецца ці не, твая задача — калі ты яго не пераканаў, значыць, ты быў падрыхтаваны недастаткова. Гэта маё меркаванне, калі ты хочаш дасягнуць мэты ў рабоце з моладдзю, працуй над сабой так, каб пераканаць у тым, што ты хочаш давесці.

***«МС»: Не так даўно пры Нацыянальным сходзе быў створаны Маладзёжны савет (парламент), чаго вы чакаеце ад маладых парламентарыяў?***

— На іх ускладаюцца вялікія чаканні: гэта павінны быць нашы пераемнікі не ў дэпутацкім, а цалкам у кіраўнічым жыцці. Павінны прыйсці людзі, якія будуць далей весці краіну наперад, яны будуць займаць розныя пасады ў міністэрствах, Саўміне, дэпутацкім корпусе, Адміністрацыі Прэзідэнта, хтосьці ўзначаліць завод ці школу, але гэта, несумненна, будуць лідары. Усе яны — 70 маладых людзей — вельмі матываваныя. Гэта студэнты, працуючая моладзь, нехта нават дзяцей сваіх мае, але ўсе яны прыйшлі, з аднаго боку, па рэкамендацыі абласцей, з другога — па асабістым жаданні. І першае іх станаўленне сведчыць аб тым, што яны жадаюць заявіць аб сабе і зрабіць для краіны шмат карыснага.

## На пенсію — толькі ў Гродна

***«МС»: Зараз, калі дазволіце, вернемся на ўзровень сям'і. Вы жывяце на два гарады — у Гродне засталіся вашы блізкія, а працуеце ў сталіцы. Я так разумею, што 260 кіламетраў для шчаслівай сям'і — не адлегласць?***

— Канешне, не адлегласць. Справа ў тым, што мы так вырашылі: дзеці, жонка працуюць, быт сфарміраваны ў Гродне. Не буду адпірацца, калі надыдзе пенсійны ўзрост, я вярнуся ў гэты горад, вельмі яго люблю. У Мінск я прыехаў працаваць, асноўны час заняты на рабоце, таму прыходжу дамоў толькі пераначаваць — мяне нішто не адцягвае ад рабочага працэсу, а для сустрэч з сям'ёй ёсць выхадныя, якія дапамагаюць падтрымліваць усё ў патрэбным балансе.



На жніўеньскай нарадзе педагогаў Гродзеншчыны (справа налева) старшыня аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК, Віктар ЛІСКОВІЧ і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.

***«МС»: Гэтая адлегласць вымушае шмат часу праводзіць у дарозе, не стамляецеся за рулём?***

— Не. Я адчуваю сябе гадоў на 20 маладзейшым за свой узрост. Наогул, калі працаваў намеснікам старшыні аблвыканкама, шмат ездзіў: трэба бываць у розных месцах, бачыць, параўноўваць, назіраць, супастаўляць і рабіць адпаведныя высновы. А потым будаваць прагнозы. Самае галоўнае, каб потым гэтыя прагнозы былі карысныя грамадству, людзям, краіне.

***«МС»: Які від адпачынку для вас можна лічыць найлепшым?***

— Перамена сферы дзейнасці... Нават калі трэба капаць бульбу — для мяне гэта ўжо адпачынак. Я вельмі не люблю пасіўны адпачынак, напрыклад легчы на беразе мора і ляжаць.

***«МС»: І напрыканцы. Ведаю, у вас шмат розных узнагарод. Назавіце, калі ласка, самую блізкую сэрцу і каштоўную?***

— Узнагарод шмат, сапраўды, але я раскажу аб некалькіх.

Хачу пачаць з першай. У першым класе за выдатную вучобу атрымаў ад дырэктара кнігу «Цімур і яго каманда». Дзеці вельмі ганарыліся, калі ім рабілі такі падарунак. Усе 10 гадоў школьнага жыцця такія ўзнагароды ў мяне прысутнічалі. У 2008 годзе я атрымаў медаль «За працоўныя заслугі», гэта была першая прэзідэнцкая сур'ёзная ўзнагарода, і яна не магла не замацавацца ў памяці. З улікам таго што атрымлівалі добрыя вынікі, напрыклад, патрыятычнае выхаванні, канешне ж, маюцца і іншыя ўзнагароды. Але асобна я хацеў бы вылучыць ордэн Пашаны, які атрымаў у сакавіку 2016 года, — гэта другая дзяржаўная ўзнагарода. Калі падсумаваць усе, то самая каштоўная — яна, безумоўна.

**Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА**
**і з архіва суразмоўніка.**

# Грошы не пахнуць

**Як у Прыдзвінскім краі выконваецца праграма па зборы і перапрацоўцы камунальных адходаў і выкарыстанні другасных матэрыяльных рэсурсаў? Гэтая тэма была ў цэнтры ўвагі на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама.**

Пра смецце, якое пры правільнай лагістыцы, разумным падыходзе можа стаць добрай і стабільнай сыравінай для вырабу чагосьці карыснага, у цэлым атрымання добрага прыбытку, «МС» не раз пісала. І, быццам бы, працэс пайшоў, але праблем хапае. Губернатар Мікалай Шарснёў патрабаваў актывізаваць выкананне адпаведных заданняў па зборы «карыснага смецця».

Працэс, мякка кажучы, буксуе. У першым паўгоддзі, напрыклад, выканалі заказ на пастаўку адходаў паперы і кардону на 46,2 %, шкла — на 48,3 %.

Тады ж купілі каля 420 спецыяльных кантэйнераў і восем смецязвозаў з прэсам для пакеціравання другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Падчас укаранення кантэйнернай сістэмы раздзельнага збору смецця сёлета на 3,9 % павялічылася колькасць жыхароў, якія раздзельна сартуюць цвёрдыя камунальныя адходы. Паводле інфармацыі на сярэдзіну года, правільна пазбаўляюцца ад адходаў 81,1 % насельніцтва.

Што датычыцца смеццеправодаў, іх закрылі ўжо больш чым у 400 жылых дамах.

А вось «смеццевых вытворчасцяў» становіцца ўсё больш. На палігонах цвёрдых бытавых адходаў Оршы, Віцебска і Наваполацка тры біягазавыя ўстаноўкі агульнай электрычнай магутнасцю 1,8 МВт з 2015 года штогод утылізуюць да 5,5 мільёна кубоў звалачнага газу. І гэтым самым не толькі прадухіляюцца выкіды парніковых газаў і забруджванне атмасфернага паветра, але і выпрацоўваецца электрычная энергія.

З 2010 года закрылі і рэкультывавалі больш за пяцьсот міні-палігонаў цвёрдых камунальных адходаў. Але эксперты лічаць, што гэтага недастаткова. Пабудавалі і ўвялі ў эксплуатацыю чатыры новыя палігоны цвёрдых камунальных адходаў: у Багушэўску, Глыбокім, Чашніках, Лепелі.

З 2010 года ў Наваполацку функцыянуе біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў. Прадпрыемства ажыццяўляе збор і вываз камунальных адходаў з Полацкага раёна і нафтаграда, сартаванне адходаў, збор другасных матэрыяльных рэсурсаў, выкарыстанне палімерных адходаў. Наладжана вытворчасць пясчана-палімерных вырабаў, ПЭТ-флексіі.

Сёлета пабудаваны смеццесартавальны завод для Віцебска, прызначаны для прыёму і паўаўтаматычнага сартавання змешаных цвёрдых камунальных адходаў. Яго прадукцыйнасць 100 тысяч тон у год. У рэспубліканскім рэестры аб'ектаў па выкарыстанні адходаў зарэгістравана больш за 100 прадпрыемстваў вобласці.

У якасці паліва шырока выкарыстоўваюцца адходы драўняныя, перапрацоўкі льну. На дзесяці прадпрыемствах ажыццяўляецца выкарыстанне палімерных, наладжана перапрацоўка будаўнічых адходаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗА КОЖНЫМ ЗВАРОТАМ СВАЯ ГІСТОРЫЯ



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла чарговы асабісты прыём грамадзян.**

У кожнага наведвальніка свая гісторыя пытання, з якім ён вымушаны звярнуцца па дапамогу ў Савет Рэспублікі. І чалавека ў верхняй палаце парламента імкнуцца ўважліва выслухаць незалежна ад складанасці вырашэння звароту, скажам, узніклі непаразуменні з органам мясцовай улады, тым жа сельскім Саветам. Часам такія пытанні хутка «знімаюцца» нярэдка адным тэлефонным званком у раён. Але прыходзяць наведвальнікі і з праблемамі, якія патрабуюць дадатковага вывучэння і нават прыняцця наспелых змен у дзеючае заканадаўства.

Звяртаюцца і прадпрымальнікі па падтрымку. Два прадстаўнікі фірмы па выпуску тавараў санітарнага прызначэння і іншай карыснай для спажыўцоў прадукцыі папрасілі тлумачэнняў і парады адносна парадку вызвалення юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў ад адміністрацыйных спагнанняў і платы пеняў. Наведвальнікі атрымалі неабходныя тлумачэнні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Нагадаем, калі сенатар Таццяна Рунец праводзіла ў Мінску свой першы асабісты прыём грамадзян у якасці старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, яна тады заўважыла прадстаўнікам СМІ, што такія прыёмы дазваляюць ёй даведвацца аб рэальных праблемах, з якімі сутыкаюцца людзі ў паўсядзённым жыцці. У гэтым вялікая каштоўнасць такой формы работы. Таму да гэтых сустрэч яна ставіцца з усёй адказнасцю. Таццяна Рунец і зараз прытрымліваецца гэтай пазіцыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

__Сяргей АНЮХОЎСКІ:__

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# «Прыярытэтны кірунак для мяне як дэпутата — паляпшэнне інвестыцыйнага клімату ў рэгіёне»

**Дырэктар бабруйскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік», член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дэпутат Магілёўскага абласавета Сяргей Анюхоўскі адзін з тых маладых кіраўнікоў, якія сёння з'яўляюцца непасрэднымі рухавікамі беларускай эканомікі. У Слаўгарадзе ў рамках выканання Указа Прэзідэнта № 235 і пры фінансавай падтрымцы дзяржавы рэалізуецца ўнікальны праект «Чырвоны харчавік–Слаўгарад». Ужо сёлета тут будзе наладжана вытворчасць мёду з уласнага пчальніка, а налета плануецца запусціць лінію па вырабе мармеладу.**



Фота з архіва прадпрыемства «Чырвоны харчавік».

Сяргей Анюхоўскі лічыць, што ўздзел у праграме развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна дасць Слаўгарадскаму раёну магчымасць палепшыць сваё эканамічнае становішча. У тым ёсць яго асабістая зацікаўленасць. Бо менавіта гэты раён, акрамя Бабруйска і Асіповіцкага раёна, ён курыруе як сенатар. Тут жывуць яго выбаршчыкі, і дэпутат паказвае, як ён стаіць на ахове іх інтарэсаў. Для Слаўгарада, дзе няма буйных вытворчасцяў, стварэнне такога прадпрыемства — гэта рэальная магчымасць забяспечыць людзей рабочымі месцамі і годнай зарплатай.

— У маёй дэпутацкай дзейнасці адным з прыярытэтных кірункаў бачу паляпшэнне інвестыцыйнага клімату ў рэгіёне, — кажа сенатар. — Слаўгарад мае вельмі вялікую патрэбу ў гэтым. На мадэрнізаваным участку прадпрыемства, у якое мы зараз укладваем грошы, будзе наладжана вытворчасць мармеладу. І мяркуецца зусім іншы ўзровень і асартымент, чым у Бабруйску. На сучасным абсталяванні будзем вырабляць 400—450 тон салодкай прадукцыі ў месяц. Два раёны вобласці будуць пераплецены нітачкай «Чырвонага харчавіка». Гэта рост эканомікі рэгіёна і як следства — напаўненне мясцовага бюджэту і стварэнне новых рабочых месцаў.

Для любога кіраўніка вельмі важна ведаць, чым дыхае калектыў, якія праблемы яго турбуюць. А для дэпутата гэта заклапочанасць не абмяжоўваецца рамкамі аднаго калектыву.

— У час асабістых прыёмаў у раёнах людзі ў большай ступені звяртаюцца з жыццёвымі праблемамі — на 70—80 % гэта пытанні ЖКГ, — кажа Сяргей Анюхоўскі. — Некаторыя просяць дапамагчы з працаўладкаваннем, з добраўпарадкаваннем і абсталяваннем дзіцячых гульнявых пляцовак, арганізацыяй руху грамадскага транспарту. Па магчымасці дапамагаю. Нядаўна да мяне звярнуліся жыхары дома з вуліцы 50-годдзя ВЛКСМ, 63а ў Бабруйску. Праблема была ў слабым ціску пры падачы халоднай вады на верхнія паверхі. Спецыялісты «Водаканала» аператыўна адрэагавалі на дэпутацкі запыт і праз некалькі дзён ліквідавалі непаладкі. Па выніках зваротаў па добраўпарадкаванні ў Асіповічах былі абсталяваны дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі. Па магчымасці вырашаю пытанні, з якімі людзі звяртаюцца падчас сустрэчы ў працоўных калектывах. Там яны часцей за ўсё датычацца работы, развіцця прадпрыемства, галіны, эканомікі. Дарэчы, на базе фабрыкі «Чырвоны харчавік» праводзяцца сумесныя прыёмы грамадзян з прадстаўнікамі заканадаўчай, выканаўчай улады, праваахоўных органаў.

У Савеце Рэспублікі за дэпутатам замацавана некалькі законапраектаў, якія зараз знаходзяцца на разглядзе парламентарыяў. Як кіраўнік з вопытам, які на адказных пасадах працуе ўжо каля 20 гадоў, Сяргей Анюхоўскі заўсёды лічыць патрэбным пацікавіцца думкай спецыялістаў.

— Калі разглядаюцца вузкія законапраекты, то стараюся падключыць прафесіяналаў на месцах, — кажа ён. — Напрыклад, за мной замацаваны закон «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці». Я звяртаўся да бухгалтараў нашага і іншых бабруйскіх прадпрыемстваў, каб яны агучылі думкі і далі экспертную ацэнку па падрыхтоўцы законапраекта. Бо менавіта яны потым будуць кіравацца гэтым заканадаўствам на месцах і вельмі важна, каб яно працавала як гадзіннік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

__АДРАС РЭДАКЦЫІ:__

__220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.__

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 10 верасня 2020 года.**

# ЯК НАДАЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ МАЛЕНЬКАЙ ВЁСАЧЦЫ?

## Адкуль ідэя?

Гэтая крама адкрылася год таму, а з 2013 года сельскі магазін быў на замку, вяскоўцаў абслугоўвала аўтакрама. У саміх Перасудавічах жыве каля ста чалавек, а яшчэ насельнікі чатырох навакольных вёсак, якія не маюць стацыянарных гандлёвых пунктаў — Галавіцкія, Высокае, Мастыкі, Пузі, — перыядычна скардзіліся на нязручнасці такога гандлю. Але ж ніхто асабліва не верыў, што сітуацыя можа істотна змяніцца...

Дзмітрый Жуковіч нарадзіўся ў гэтай вёсцы. І хоць у школу ён хадзіў ужо ў Бярозе — сям'я перабралася ў горад, менавіта вёску лічыць сваёй радзімай. Кожныя выхадныя стараецца заехаць сюды, пабыць, падыхаць свежым паветрам. «Які б ні быў напружаны рытм цягам тыдня, за дзень тут адпачываю душой і з новымі сіламі прыступаю да работы», — гаворыць былы вясковец.

Дзмітрый працуе дырэктарам прыватнага прадпрыемства «БярозаУАЗаўтасэрвіс». Бізнес цяпер вельмі актуальны і запатрабаваны — рамонт і абслугоўванне машын. Рабочыя месцы маюць 20 чалавек. Ёсць свая вытворчая база, стабільны паток кліентаў. Але ж кожны бізнес жыццяздольны толькі калі ён не стаіць на месцы, а развіваецца. Пашыраць дзеючую вытворчасць у райцэнтры, можа, і няма вялікай патрэбы. Дзмітрый Жуковіч не раз задумваўся, чым займацца далей, пракручваў у галаве розныя варыянты. Ды «тую самую» ідэю з яго слоў падказалі вясковыя бабулькі, якія аднойчы каля сцен старога магазіна, што і не відаць з-за хмызняку і кустоўя, сталі ўспамінаць, як жа было добра, калі ён працаваў. Рашэнне прыйшло адразу. Праўда, многія напачатку адгаворвалі — маўляў, хто будзе хадзіць у гэтую краму, прагарыш, не акупяцца затраты. Але ж працэс, як той казаў, пайшоў. Спачатку на аўкцыёне быў выкуплены будынак былога гандлёвага аб'екта, потым праведзена яго рэканструкцыя. А яна ў дадзеным выпадку азначае амаль поўнае абнаўленне. Засталіся хіба толькі сцены. Сёння магазін уяўляе сабой сучасны стыльны будынак з новымі вокнамі, дзвярамі, унутранымі камунікацыямі і абсталяваннем.

## Асартымент і выручка

Гандлёвая зала не вельмі вялікая, але запоўнена шчыльна і рацыянальна. Мне часта даводзіцца бываць у вёсках, блізкіх да горада і аддаленых, але такой асартыментнай разнастайнасці, шчыра кажучы, бачыць не выпадала. Напрыклад, толькі алею на паліцы налічыла сем відаў. Прадстаўлена


Добраўпарадкаванне вакол магазіна.

тры вытворцы малочнай прадукцыі, тры мясакамбінаты, а днямі іх будзе яшчэ больш, сказалі ў магазіне. Прамысловая група ўяўляе сабой разнастайныя тавары першай неабходнасці, ёсць гаспадарчыя дробязі, тавары для адпачынку.

Што радуе гаспадынь — у халадзільных камерах шмат розных паўфабрыкатаў. А што асабліва каштоўна для ўсіх вяскоўцаў — гандлёвыя надбаўкі мінімальныя. У продажы ёсць рыба ад двух вытворцаў.

Прадавец Кацярына Пракапюк расстаўляе на паліцах толькі што прывезеныя прадукты. «Бачыце, смятана, тварог ад учарашняга дня, — звярнула яна маю ўвагу на дату, пазначаную на ўпакоўцы. — У нас кожны дзень завоз, прадаём усё свежае. Хлеб прывозяць таксама штодня. А ў час завозу мясной прадукцыі пакупнікі загадзя прыходзяць, тут шмат людзей стаіць».

Вось і адказ на пытанне, хто будзе хадзіць у краму і даваць выручку. Людзі хутка ацанілі якасны гандлёвы сэрвіс, і ў магазін пайшлі-паехалі не толькі жыхары навакольных вёсак, але і гараджане з Белаазёрска, да якога адсюль 12 кіламетраў. Ды і жыхары Бярозы, калі едуць па трасе, часта збочваюць, каб зрабіць пакупкі.

— Мы ўсё робім для нашага пакупніка, — працягвае Кацярына Пракапюк. — Летам у вёсцы многа дзяцей, ды і людзей наогул становіцца больш, тады пашыраем групу кандытарскіх вырабаў. Ёсць машына для свежага квасу на разліў, ён карыстаецца асаблівым попытам у спёку. Завозім агародніну і садавіну. Цяпер гэтай групы тавараў менш, бо ўсе сабралі ўраджай у агародах. А пад зіму завязём бананы, апельсіны, ківі.

Магазін працуе без выхадных і перапынкаў на абед. Пакупнікі патроху ідуць нават у будны дзень. На машыне пад'ехала группка жанчын, аказваецца, яны з Белаазёрска, былі ў лесе, збіралі грыбы, па дарозе вырашылі заехаць зрабіць пакупкі. А мясцовыя жыхары Тамара і Уладзімір Мікіцічы жывуць насупраць — яны нарадавацца не могуць новай гандлёвай кропцы:

— Ну што вы, якое параўнанне?! — эмацыянальна выказваецца Тамара Дзмітрыеўна. — Што такое аўтакрама: стой, чакай, асабліва ў непагадзь пад дажджом ці снегам. А прыедуць — то аднаго няма, то другое скончылася, і такое бывала. Мы з мужам у асноўным у горад за прадуктамі ездзілі. А цяпер мы з новага года ў гарадскіх магазінах не былі. Шкада толькі, што толькі зараз гэты магазін адкрылі. Нам жа цяпер і сустрэцца, пагаварыць ёсць дзе.

## На шляху да турыстычнага цэнтра

Вясковы магазін — цяпер адзіны ў вёсцы сацыяльны аб'ект. Летам насельніцтва Перасудавічаў павялічваецца ледзь не ўдвая, тады прыходзяць сем'і з дзецьмі. Таму было вырашана ўладкаваць побач дзіцячую пляцоўку. Спачатку былі пастаўлены вялікія драўляныя арэлі. Але дрэва стала цямнець ад уздзеяння ападкаў, таму хутка прывязуць дах. Побач з'явяцца іншыя забаўкі для дзяцей. Два батуты, дарэчы, ужо ёсць.

А для дарослых побач з магазінам устаноўлены дзве вялікія альтанкі накшталт верандаў. Унутры стаяць сталы з лаўкамі. Мэбля драўляная, стылізаваная пад даўніну. Столь упрыгожваюць каваныя жырандолі — вырабы мясцовых кавалёў. Збоку размешчаны мангал з дрывотняй. У кожнай з альтанак свабодна размесцяцца два дзясяткі чалавек, якія захочуць паабедаць ці павячэраць. За карыстанне, у тым ліку мангалам, кампаніі давядзецца заплаціць усяго 30 рублёў.

— Летам паслуга была запатрабаваная, — расказвае Дзмітрый Жуковіч — многія едуць у Спораўскі заказнік пафатаграфаваць нашу знакамітую вяртлявую чаротаўку, спыняюцца перакусіць. Некаторыя нават замаўлялі абед — мы прывозілі з Бярозы, з рэстарана.

Аднойчы нехта з адпачывальнікаў сказаў, што з дарогі было б добра прыняць душ, адпачыць. Логіка развіцця інфраструктуры падказвае, што трэба будаваць турыстычныя дамкі. Таму мы пайшлі далей, атрымалі зямельны ўчастак для ўзвядзення чатырох домікаў для турыстаў. Ля альтанак для адпачынку таксама вядзецца далейшая работа, дрывотня прыводзіцца ў цывілізаваны выгляд, абсталёўваюцца чатыры санвузлы. А турыстычныя домікі будуць вось тут, — паказвае гаспадар — каля сасновага бору. Калі ўсё будзе добра, у далейшых планах — узвядзенне невялікага рэстаранчыка для забеспячэння харчавання турыстаў. Усе патрэбныя дазволы атрыманы, узгадненні па зямельным пытанні праведзены, зараз ідзе праектаванне аб'ектаў.

Маю ўвагу прыцягвае даволі вялікая цагляная пабудова, што стаіць побач з магазінам. Дзмітрый Уладзіміравіч тлумачыць: гэта будынак былой пачатковай школы. Яна закрылася шмат дзесяцігоддзяў таму, пазней на яе месцы былі клуб і бібліятэка, потым — Дом сацыяльных паслуг. Зараз будынак фактычна не выкарыстоўваецца. У таварыства з дадатковай адказнасцю «БярозаУАЗаўтасэрвіс» ёсць свае планы на тое, як надаць аб'екту новае жыццё. Вядома, у тым выпадку, калі атрымаецца яго набыць па прымальнай цане. У былой школе, аказваецца, захаваўся невялікі этнаграфічны музей, які збіралі некалькі пакаленняў настаўнікаў, вучняў, работнікаў культуры. Яго можна развіваць.

— Палепшыць, пашырыць музей, зрабіць з яго турыстычную «разыначку», — загараюцца вочы ў Дзмітрыя Жуковіча. — Ведаеце, якія ў нас тут найцікавейшыя мясціны? Вёска называецца Перасудавічы, а там, за рэчкай ёсць Судзілавічы. Дык вось, існуе легенда, што некалі, у часы сівой даўніны, у Судзілавічах асуджалі людзей, высылалі, а тут вярталі іх добрае імя, пэўным чынам рэабілітавалі. Значыць, там быў суд, а тут перасуд, і брала верх праўда, справядлівасць. Вось такія нашы Перасудавічы. А пра асаблівую энергетыку гэтых мясцін я ўжо казаў. Таму перакананы, што тыя турысты, якія прыедуць да нас адпачыць, захочуць сюды вяртацца зноў і зноў — каб падыхаць чыстым паветрам, набрацца сіл, зарадзіцца спакоем і аптымізмам. Я думаю, што недалёкі той час, калі з гарадоў людзі пачнуць вяртацца ў сельскую мясцовасць.

**Старшыня Стрыгінскага сельскага Савета Іван КРАГЕЛЬ** лічыць, што Перасудавічам вельмі пашанцавала з земляком:

— Не ўяўляю, калі могуць акупіцца ўкладзеныя ім сродкі, але ж відавочна, што Дзмітрый Жуковіч думае на перспектыву. Вёска папрыгажэла, на вачах стала напаўняцца жыццём. Гараджане купілі чатыры пустуючыя хаты, а больш нашы вяскоўцы, наколькі ведаю, не маюць намеру прадаваць. Гавораць, што будуць падтрымліваць бацькоўскія сядзібы, каб мець магчымасць прыязджаць і адпачываць у іх. Цяпер у нас добрая дарога, нядаўна пракладзены асфальт. Паабапал ракі Ясельды расцягнуліся знакамітыя балоты, якія ўваходзяць у Спораўскі заказнік — нашы найлепшыя славутасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Бярозаўскі раён.*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 06 октября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| Бетоноукладчик в комплекте «Гомако» б/н, год выпуска – 1990, инвентарный номер 44034 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырёво |
| Начальная цена: 167 656,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 16 700,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырёво, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **06 октября 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.09.2020 по 02.10.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(033) 333-80-52 (ОАО «ДСТ № 7»).**

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 24 сентября 2020 года в 15.20 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Бульдозер «ДЗ-110», тип ТС – бульдозер гусеничный, 1988 г. в. | 5040,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 504,00 |
| Лот № 4 | Прицеп «2 ПТС-4.5», тип ТС – прицеп тракторный, 1998 г. в. | 1200,00 | | 120,00 |
| Лот № 5 | Здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в. | 1360,00 | | 136,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **24 сентября 2020 в 15.20** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **21.09.2020 г.,** время: **17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

Гарадское асяроддзе

# Чатыры эпохі ў цэнтры Гродна

## Якія рэальныя асобы «ажылі» на маляваных парталах

**У абласным цэнтры з'явіліся маляваныя парталы, у якіх адлюстраваныя чатыры гістарычныя перыяды горада. Цікава, што некаторыя персанажы маюць рэальных прататыпаў, іншыя нагадваюць вядомых асоб.**

Гродзенскі мастак-рэстаўратар Аляксей Навумчык не першы раз бярэцца за ўвасабленне гарадскога асяроддзя на будынках. Пачынаў ён з відаў горада пачатку XX стагоддзя. Але роспіс не захаваўся, бо будынак з-за аварыйнага стану знеслі. Але гаспадары пабудоў, а гэта гандлёвы дом «Нёман», прапанавалі ажыццявіць новы праект. У мастака была ідэя ўвасобіць розныя эпохі з гісторыі горада. Пасля таго, як эскізы былі прынятыя і зацверджаныя, Аляксей прыступіў да іх рэалізацыі. Работы пачаліся ў красавіку, і вось нядаўна ва ўнутраным дворыку гандлёвага цэнтра з'явіліся маляўнічыя парталы, на якіх адлюстраваныя чатыры эпохі — рэнесанс, эпоха царызму, міжваенны час і сталы савецкі. Усе работы выкананыя акрылавымі фарбамі ў стылі фрэсак.

Як расказаў сам аўтар, у аснoўным ён працаваў па фотаздымках. Але не толькі. Напрыклад, увасабленне горада XVII стагоддзя базіруецца на гравюры Макоўскага. Старажытны горад ідзе далёкім фонам, а бліжэй да гледача, у прыгожых пакоях, малады чалавек гадае на рамонку, а за ім свае адносіны высвятляе маладая пара — гэта знакамітыя героі шэкспіраўскіх трагедый. Дарэчы, твар Гамлета нечым нагадвае самога мастака. Але Аляксей не пагаджаецца: каб ён хацеў намаляваць сябе, зрабіў бы яго больш падобным.



А вось наступныя парталы заснаваныя на дакументальных матэрыялах. Праўда, «царскі» перыяд у жыцці Гродна канца XIX стагоддзя прадстаўлены з некалькіх фотаздымкаў дарэвалюцыйных часоў. Добра бачныя старыя будынкі, Фара Вітаўта, якую знеслі ў 60-я гады. А ў цэнтры — дзве маладыя графіні, за якімі пільна назірае малады чалавек. Гэта ўвогуле тыповая гісторыя для ўсіх часоў, калі дзяўчаты ідуць, а ім услед паглядаюць хлопцы. Як патлумачыў аўтар, фігуры дабаўлены на канкрэтнае месца горада, а самі персанажы паходзяць з іншых крыніц.

Адрозная гісторыя ў партала міжваеннага перыяду. Малюнак зроблены з канкрэтнага фотаздымка. І тут усе персанажы рэальныя. Такая сям'я сапраўды некалі жыла ў Гродне, а хлопчык, што стаіць з бацькамі, жыве і зараз, толькі ўжо ў Польшчы. Праўда некаторыя будынкі, якія бачныя за плячыма гродзенскага сямейства, не дайшлі да нашых часоў. Затое брукаванка тая самая, старажытная.

А вось сюжэт партала 70-х гадоў многія гродзенцы пазнаюць і зараз. На ім — будынак старога ўнівермага з усімі атрыбутамі тых часоў. Многія памятаюць паласатыя навесы каля сцен. Па словах Аляксея, некаторыя рысы таго часу ён увасобіў і са сваёй памяці. Напрыклад, абаранкі ў руках, шкарпэткі дзяўчынак, туфлі-лодачкі, бутэлькі з малаком, чамадан — гэта ўсё характэрна для таго перыяду. Для паўнаты карціны каля ўнівермага з'явіліся і аўтамабілі «Масквіч» і «Волга».

На пярэднім плане звяртае на сябе ўвагу постаць мужчыны з кнігай у руках. Саму кампазіцыю аўтару нагадаў вядомы савецкі фільм пра Шурыка. Вось і куртка на ім амаль такая ж. І хаця сам мастак гэты вобраз назваў зборным, у мужчыне можна пазнаць таксама вядомага беларускага пісьменніка Васіля Быкава, які доўгі час жыў і працаваў у Гродне. А кніга ў руках — чым не сімвал яго пісьменніцкага таленту?!.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.36 | 19.35 | 12.59 |
| Віцебск — | 6.24 | 19.26 | 13.02 |
| Магілёў — | 6.26 | 19.25 | 12.59 |
| Гомель — | 6.24 | 19.20 | 12.56 |
| Гродна — | 6.51 | 19.50 | 12.59 |
| Брэст — | 6.54 | 19.49 | 12.55 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 10 верасня. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

***Пр.*** *УСЕКНАВЕННЕ ГАЛАВЫ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ. Івана, Ісака.* ***К.*** *Прота, Пятра, Фелікса, Яна, Яцка.*



Фота Вікторы МІРОНЧЫК.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**11 ВЕРАСНЯ**

**У краіне**

**1790** год — нарадзіўся Венцаслаў Венцаслававіч Пелікан, рускі і беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцыны.



**1855** год—нарадзіўся Еўдакім Раманавіч Раманаў, беларускі этнограф, фалькларыст, археолаг.

**1885** год — нарадзіўся Адам Сямёнавіч Славінскі, удзельнік польскага і расійскага рэвалюцыйнага руху, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі.

**1900** год — нарадзіўся Фёдар Аляксеевіч Баталаў, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939—1940 гадоў войнаў. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў на Заходнім фронце. Вызначыўся ў ліпені 1941 года пры нанясенні контрудару ў раёне Жлобіна і Рагачова.

У гэты ж дзень — нарадзіўся Іван Мікітавіч Русіянаў, удзельнік баёў на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза.

**1945** год — нарадзіўся Уладзімір Мікалаевіч Рыжанкоў, беларускі грамадскі дзеяч, педагог, заслужаны трэнер Беларусі, заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Беларусі.

**У свеце**

**1700** год — нарадзіўся Джэймс Томсан, англійскі паэт. Аўтар паэм «Свабода» і «Замак бяздзейнасці». Адным з першых выказаў сентыментальныя настроі ў паэме «Поры года», напісанай белым вершам, якая аказала значны ўплыў на еўрапейскую і рускую літаратуры.

**1845** год — нарадзіўся Жан Марыс Эміль Бадо, французскі вынаходнік у галіне тэлеграфіі.

**1865** год — нарадзіўся Ян Райніс, народны паэт Латвіі.

**1900** год — нарадзіўся Сямён Аляксеевіч Лавачкін, савецкі канструктар авіяцыйнай і ракетнай тэхнікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1935** год — нарадзіўся Герман Сцяпанавіч Цітоў, касманаўт, Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР, генерал-палкоўнік авіяцыі, кандыдат ваенных навук. У 1961-м ажыццявіў другі ў свеце касмічны палёт на караблі «Усход-2».

**1940** год — нарадзіўся Браян Дэ Пальма, амерыканскі кінарэжысёр.

**Так гаварыў...**

**САКРАТ:**

*«П'янства не параджае заган, яно іх выяўляе».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Муж і жонка ў тэатры...**

**— Лідачка, табе зручна сядзець?**

**— Так, Васілёк, зручна!**

**— Табе бачна?**

**— Так, любы.**

**— Табе не дзьме?**

**— Не, залаты.**

**— Давай памяняемся месцамі.**

Стары скардзіцца доктару, што дрэнна чуе левым вухам.

Пасля агляду доктар кажа:

— Нічога не магу зрабіць. Гэта старасць.

— А што, мае левае вуха старэйшае за правае?

**Турыст прыляцеў на курорт. У аэрапорце, узяўшы таксі, ён распытвае таксіста:**

**— Скажыце, а тут на самай справе ўнікальны аздараўленчы клімат?**

**— Так, безумоўна. Калі я тут з'явіўся, я не мог сказаць ні слова, у мяне на галаве не было валасоў. У мяне не хапала сіл нават хадзіць, і мяне насілі на руках.**

**— І даўно вы тут?**

**— Я тут нарадзіўся.**

— Вы верыце ў каханне з першага позірку?

— Не, у маім узросце зрок ужо падводзіць... трэба мацаць.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 317 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2843.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12